**ДАВЕДКА**
**да заданняў гарадскіх, раённых алімпіяд**
**па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура"**

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 5 | 50 |

## V клас

**Заданне 1. Адкажыце на пытанні.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. Назавіце зычны гук, які найчасцей сустракаецца ў назвах шасці абласных цэнтраў Беларусі? *(Гук [с] сустракаецца найчасцей – 3 разы (Брэст, Віцебск, Мінск); гукі [р], [к], [г], [л'], [м'], [н'] сустракаюцца двойчы, астатнія – адзін раз)*

2. Кісламалочны дыетычны прадукт, які ўяўляе сабой густое скіслае малако. Назва паходзіць непасрэдна ад тэхналогіі атрымання прадукту шляхам простага скісання малака ў цёплым памяшканні. *(Сыракваша або прастакваша)*

3. Закончыце фармулёўку: Фанетыка – раздзел навукі аб мове, у якім *(вывучаюцца гукі мовы).*

4. Вядома, што тэкст – гэта цэласнае выказванне, у якім сказы аб'яднаны тэмай, сэнсам і граматычна. Дапішыце прымету тэксту, якой не хапае ў пераліку: тэматычнае адзінства, разгорнутасць, …, звязнасць. *(паслядоўнасць)*

5. Сёння ў свеце налічваецца больш за шэсць тысяч моў. Палова з іх знаходзіцца пад пагрозай знікнення. Дзеля іх захавання і быў абвешчаны Міжнародны дзень роднай мовы. Які дзень абраны для святкавання? *(21 лютага)*

**Заданне 2. Уявіце сябе настаўнікамі. Вы выклікалі вучня да дошкі запісаць слоўнікавыя словы. Вучань напісаў:**

*Спаччына, рэл'еф, дзівісся, камп'ютар, тэрыторыя, подзьвіг, мятал, спектакаль, трэніроўка, акіан.*

**Выпраўце ў словах памылкі, калі яны ёсць, і запішыце словы правільна.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за кожны правільны адказ).*

*Спадчына, рэльеф, дзівішся, камп'ютар, тэрыторыя, подзвіг, метал, спектакль, трэніроўка, акіян.*

**Заданне 3. Аднавіце ўстойлівыя спалучэнні па іх агульным значэнні, пачынаючы са слова *даць*.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| | | |
|---|---|---|
| "кідацца наўцёкі, імкліва ўцякаць" | даць | *даць ходу (драпака)* |
| "забяспечыць свабоду дзеяння" | | *даць волю* |
| "цвёрда абяцаць што-небудзь" | | *даць слова* |
| "браць адказнасць за каго-небудзь" | | *даць галаву на адрэз (адсячэнне)* |
| "дапускаць памылку, памыляцца" | | *даць маху (асечку)* |

**Заданне 4. Перабудуйце сказы так, каб паміж дзейнікам і выказнікам можна было паставіць працяжнік, а сэнс сказаў не змяніўся.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

1. Аркадзь Куляшоў быў адным з лепшых паэтаў XX стагоддзя. 2. Пінск з'яўляецца адзным з найстаражытнейшых беларускіх гарадоў. 3. У гісторыю беларускай літаратуры Янка Купала ўвайшоў як стваральнік літаратурнай мовы. 4. Вяртанне Францішака

Багушэвіча на радзіму было пераваротам у яго лёсе. 5. Кнігу прынята лічыць скарбніцай ведаў, выдатных думак, добрых парад.

*Адказ:* *<u>1. Аркадзь Куляшоў — адзін з лепшых паэтаў XX стагоддзя. 2. Пінск — адзін з найстаражытнейшых беларускіх гарадоў. 3. У гісторыі беларускай літаратуры Янка Купала — стваральнік літаратурнай мовы. 4. Вяртанне Францішака Багушэвіча на радзіму — пераварот у яго лёсе. 5. Кніга — скарбніца ведаў, выдатных думак, добрых парад.</u>*

**Заданне 5. Пастаўце адпаведныя знакі ў пустыя клеткі табліцы. Пры адказе "так" пастаўце знак "+", пры адказе "не" – пастаўце "–".**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| № п/п | Пытанне | Адказ |
|---|---|---|
| 1. | Усе назоўнікі ў беларускай мове могуць ужывацца ў форме як адзіночнага, так і множнага ліку | – |
| 2. | У прыметніка, які стаіць ў форме множнага ліку, можна вызначыць род | – |
| 3. | Ці згодны вы, што пры пісьмовым ветлівым звароце да старэйшых займеннік вы пішацца з вялікай літары? | + |
| 4. | Мастацкае азначэнне, якое вобразна характарызуе прадмет, з'яву, чалавека, называецца параўнанне | – |
| 5. | Казка Я. Коласа "Крыніца" апавядае пра дзяцінства вясковых падлеткаў, іх сяброўства | – |

**Заданне 6. Перакладзіце словы на беларускую мову і ў пустыя клеткі пастаўце адпаведныя лічбы: 1 – колькасць складоў у словах аднолькавая; 2 – складоў больш у рускім слове; 3 – складоў больш у беларускім слове.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*
*(0,25 бала – за кожную правільна запоўненую клетку).*

| Рускае слова | Беларускае слова | Лічба | Рускае слова | Беларускае слова | Лічба |
|---|---|---|---|---|---|
| гроза | *навальніца* | 3 | новолуние | *маладзік* | 2 |
| оттепель | *адліга* | 1 | октябрь | *кастрычнік* | 3 |
| роща | *гай* | 2 | судьба | *лёс* | 2 |
| утро | *раніца* | 3 | погода | *надвор'е* | 1 |
| волна | *хваля* | 1 | метель | *мяцеліца (завіруха, завея)* | 3 |

**Заданне 7. З прапанаваных сказаў з вершаў беларускай паэтэсы Ніны Мацяш выпішыце падкрэсленыя назоўнікі і ахарактарызуйце іх у табліцы:**

*Максімальная колькасць балаў – 5*
*(0,2 бала – за кожную правільна запоўненую клетку).*

Шырэюць ды глыбеюць скаргі, <u>жалі</u>, збіваюць з ног брыды ўсялякай хвалі.
І кожнае зярнятка ў кожным <u>яблыку</u> задыхала з абуджанай маркотай.
Табе ўсё адно, ступакі цябе мераюць, колы ці <u>капыты.</u>
Але ж і ў радасці, і ў <u>скрусе</u> наяве зліты мы і ў мроі.
Раптова прасветлена гляне <u>адліга</u> з-пад волкіх павек.

**Узор:** Нібы два пялёстачкі, тонем у галавакружна расчыненых сонечных <u>тонях.</u>

| Назоўнік | Пачатковая форма | Граматычныя катэгорыі | | | Тып скланення |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Род | Лік | Склон | |
| Узор: (у) тонях | тоня | ж. | мн. | месны | 1 |
| жалі | *жаль* | *м.* | *мн.* | *назоўны* | *2* |
| (у) яблыку | *яблык* | *м.* | *адз.* | *месны* | *2* |
| капыты | *капыт* | *м.* | *мн.* | *назоўны* | *2* |
| (у) скрусе | *скруха* | *ж.* | *адз.* | *месны* | *1* |
| адліга | *адліга* | *ж.* | *адз.* | *назоўны* | *1* |

**Заданне 8. Пазнайце займеннікі па іх характарыстыцы. Складзіце сказы з займеннікамі ў абазначанай форме.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (0,5 бала – за правільную форму займенніка; 0,5 бала – за сказ).*

| Характарыстыка | Займеннік | Сказ |
|---|---|---|
| 3-я асоба, адз. л., ж. р., Р. скл. | *яе* | |
| 1-ая ас., мн. лік, Т. скл. | *намі* | |
| 1-ая ас., адз. лік, Д. скл. | *мне* | |
| 2-я асоба, адз. л., Д. скл. | *табе* | |
| 3-я асоба, мн. л., Т. скл. | *імі* | |

**Заданне 9. Вызначце, якім жанрам адпавядаюць прыведзеныя творы. Суаднясіце лічбу і літару (напрыклад, А1, Б2, В3, Г4, Д5).**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| | |
|---|---|
| А. Людзей слухай, а свой розум май. | 1. Загадка |
| Б. “Пестунь” | 2. Легенда |
| В. Я. Брыль “Зялёная школа” | 3. Казка |
| Г. Хто ходзіць зранку на чатырох, днём — на дзвюх, а вечарам — на трох нагах? | 4. Апавяданне |
| Д. “Разумная дачка” | 5. Прыказка |

***Адказ:** <u>А5, Б2, В4, Г1, Д3</u>*

**Заданне 10. Запоўніце табліцу.**

*Максімальная колькасць балаў – 5 (1 бал – за кожны правільны адказ).*

| Аўтар | Назва твора | Радкі з твора |
|---|---|---|
| Максім Танк | *<u>“Ля вогнішч начлежных”</u>* | Прыносіў ёй розныя забаўкі ён:<br>То нейкае дзіва лясное,<br>То часам пявунню-жалейку як звон,<br>І нават люстэрка жывое. |
| Пятрусь Броўка | “Калі ласка!” | *<u>Любыя радкі з верша</u>* |
| *<u>Народ</u>* | “Лёгкі хлеб” | Касіў на лузе касец. Змарыўся і сеў пад кустом адпачыць. Дастаў торбачку, развязаў і пачаў есці. Выходзіць з лесу галодны воўк. Бачыць — касец пад кустом сядзіць і нешта есць. |
| Уладзімір Караткевіч | *<u>“Нямоглы бацька”</u>* | Жылі сілай, а розум забывалі. Жылі сённяшняй карысцю. Знішчалі “ўчора” і таму не мелі права на “заўтра” |
| *<u>Уладзімір Караткевіч</u>* | “Бацькаўшчына” | А вакол травіцы роснай рай<br>І бярозак белая сям’я.<br>Мой чароўны беларускі край,<br>Бацькаўшчына светлая мая! |